# ЗАКЛЮЧЭННЕ

савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” па дысертацыі ШАЎЧЭНКА Яны Сяргееўны «Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)»

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.** Дысертацыя Я. С. Шаўчэнка адпавядае спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія і галіне – гістарычныя навукі.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.** У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай этналогіі з выкарыстаннем міждысцыплінарных метадаў вызначаны заканамернасці развіцця народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.; вылучана перыядызацыя заканамернасцей трансфармацыі народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў азначаны перыяд; абгрунтавана значнасць ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучасных этнакультурных працэсах Рэспублікі Беларусь; уведзены ў навуковы зварот палявыя этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя аўтарам у 2009 – 2022 гг.

**Фармуліроўка канкрэтных навуковых вынікаў, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень.** У адпаведнасці з пп. 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь па выніках дысертацыйнага даследавання “Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)” Шаўчэнка Яне Сяргееўне прысудзіць вучоную ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія за:

- выяўленне рэгіянальнай спецыфікі і заканамернасцей выкарыстання ведаў пра дзікарослыя расліны ў матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст. (вызначэнне лакальных назваў раслін; асноўных накірункаў, спосабаў і формаў выкарыстання ў розных рэгіёнах краіны; тэндэнцый прымянення ведаў пра расліны);
- вызначэнне лакальных асаблівасцей, асноўных заканамернасцей і прычын трансфармацыі ведаў пра дзікарослыя расліны ў каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст. (функцыянальны аспект ужывання раслін у рэгіянальнай абраднасці; класіфікацыя раслін паводле сферы прымянення ў абрадах з улікам гендэрнага і прыродна-кліматычнага фактараў; дынаміка зменаў у выкарыстанні раслін у каляндарных і сямейных абрадах);
- этналагічнае абгрунтаванне значнасці ведаў пра дзікарослыя расліны як фактара кансалідацыі беларускага грамадства і павышэння яго экалагічнай самасвядомасці ў межах сучасных этнакультурных працэсаў Рэспублікі Беларусь (вызначэнне перспектыўных кірункаў выкарыстання ведаў пра дзікарослыя расліны ў эканамічнай сферы для стварэння экалагічных маршрутаў, айчынных раслінных лагатыпаў і брэндаў, арганізацыі траўных фестываляў, музеяў і экспазіцый);
- вылучэнне перыядызацыі асноўных заканамернасцей трансфармацыі народных ведаў пра дзікарослыя расліны Беларусі канца XIX – пачатку XXI ст.;
- увядзенне ў навуковы зварот новага палявога матэрыяла, назапашанага ў этнаграфічных экспедыцыях на тэрыторыі Беларусі ў 2009 – 2022 гг.

**Рэкамендацыі па выкарыстанню вынікаў даследавання.** Вынікі і матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы студэнтаў ВНУ ў выкладанні дысцыплін “Этналогія і этнаграфія Беларусі”, “Гісторыя Беларусі”, “Гісторыя сусветнай культуры”, “Гістарычнае краязнаўства Беларусі” ў Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Еўфрасінні Полацкай. Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні навукова-метадычных матэрыялаў і ў якасці практычных рэкамендацый пры распрацоўцы дзяржаўных праграм па азнаямленні з самабытнай духоўнай культурай беларусаў у краіне і за мяжой; у эканамічнай сферы з мэтай папулярызацыі айчыннай эканомікі цераз выкарыстанне нацыянальных раслінных сімвалаў і брэндаў.

Вынікі даследавання таксама выкарыстоўваюцца ў экскурсійнай, музейна-педагагічнай дзейнасці, і ў распрацоўцы фондавай калекцыі Прыродна-экалагічнага музея Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Старшыня савета па абароне дысертацый Г.І. Каспяровіч
Сакратар савета па абароне дысертацый Г.І. Цяпкова